# Радзіна Булак–Балаховічаў на Браслаўшчыне і Дзісеншчыне да Першай усясьветнай вайны

Станіслаў Мар'ян Булак–Балаховіч нарадзіўся 10 лютага 1883 г. у Мэйштах у каталіцкай сям'і сялянскага паходжаньня. Ягонымі дзядамі "па мячы" былі Сыльвэстар Балаховіч і Міхаліна з роду Ясінскіх. Мелі яны двух сыноў, Нікадзіма Міхала, які нарадзіўся 1 красавіка 1856 г. у засьценку Багашышкі на Браслаўшчыне, ды Людвіка.

Нікадзім Міхал Балаховіч асірацеў ва ўзросьце 7 гадоў, выхоўваўся пры сваім стрыі, надлесьніку ў маёнтку Мэйштовічаў. Працаваць пачаў 13–гадовым хлапчуком як "кухцік" — памагаты падкухара ў Мэйштовічаў у Мэйштах. З часам стаў кухарам. Падчас службы ў Мэйштовічаў ажаніўся зь Юзэфай з роду Шафранаў, пакаёўкай Марыі Мэйштовічыхі. Бацька Юзэфы, Язэп Шафран, быў кухарам у Корвін–Мілеўскіх з Ашмяншчыны, зь якіх паходзіла Марыя Мэйштовічыха. Такім чынам, будучы генэрал быў сапраўды "кухарскага" паходжаньня.

У нейкі час пасьля жаніцьбы Балаховічы, дзякуючы ашчаднасьцям і пазыцы, якую атрымалі ад Мэйштовічаў, купілі разам зь Людвікам Балаховічам маёнтак Юдуцыны пад Шаркаўшчынай. У 1887 годзе яны прадалі гэты маёнтак графу Лапчынскаму, дзелячыся жывым і мёртвым інвэнтаром і сплачваючы даўгі. Пасьля продажу Юдуцынаў Нікадзім узяў у доўгатэрміновую арэнду маёнтак Стакапіёва на Браслаўшчыне, які належаў Мэйштовічам. Людвік арандаваў маёнтак Самолішкі (уласнасьць сям'і Барэйкаў), таксама на Браслаўшчыне.

Нікадзім і Юзэфа Балаховічы мелі 9 дзяцей: трох сыноў і шэсьць дачок. Найстарэйшаю зь іх была дачка Марыя, наступным — Станіслаў. Ягоныя браты былі намнога малодшыя: Язэп нарадзіўся ў 1894, а Мечыслаў — у 1899 г. Малодшыя сёстры называліся: Паўліна, Людміла, Вераніка, Ганна і Стэфанія.

Па мужчынскай і жаночай лініі сваякамі Балаховічаў зьяўляліся сем'і Карловічаў, Лапінскіх, Ясінскіх, Лаўрыновічаў, Рабэльчышаў, Эйсмантаў, Рудзінскіх і Балаховічаў. Усе яны жылі на Браслаўшчыне і Сьвянцяншчыне.

Сваё імя Станіслаў, першы сын Балаховічаў, атрымаў па хросным бацьку Станіславе Незабытоўскім. Хроснаю маці была Марыя Мэйштовічыха.

Пачатковую школу Станіслаў закончыў у Новааляксандраўску. Пасьля вучыўся ў чатырохгадовай прыватнай польскай гімназіі сьв. Станіслава ў Пецярбургу, дзе апекаваўся ім дзядзька, ксёндз Ксавэры Ясінскі. Пажаданьнем сям'і было, каб Станіслаў паступіў у духоўную сэмінарыю. Паколькі было яму тады толькі 16 гадоў, правёў гадавую практыку ў маёнтку Міхала Мэйштовіча, пасьля чаго пакінуў думку аб сьвятарстве. Закончыў чатырохгадовы практычны курс у маёнтку Броэль–Плятэраў у Бяльмонтах.

З 1902 г. пачаў самастойна зарабляць на сябе. У 1903 г. працаваў як бухгальтар пры пабудове чыгункі на Наваградчыне. Зіму правёў на Каўказе ў свайго швагра, загадчыка чыгуначных складоў. З 4 сакавіка 1904 г. да 15 кастрычніка 1914 г. Станіслаў Балаховіч працаваў як упаўнаважаны адміністратар маёнтку Гарадзец–Лужкі на Дзісеншчыне, які належаў графам Зыберк–Плятэрам. У гэтым маёнтку знаходзіўся славуты конезавод. У маёнтку і ў мястэчку Балаховіч арганізаваў добраахвотную пажарную каманду, якую ўзначальваў ажно да вайны.

21 жніўня 1905 г. Станіслаў Балаховіч ажаніўся з дачкой лекара з Лужкоў Марціна Гарбэля. Балаховічы мелі дачку Альдону, двух сыноў, Мэдарда Юліюша і Генрыка. З 1913 г. сужонства Балаховічаў было ў сэпарацыі.

Бацька Станіслава Булак–Балаховіча быў сьвядомым беларусам. Маці, выхаваная пры сям'і Корвін–Мілеўскіх, якія вельмі варожа ставіліся да беларушчыны, — палячкай. Дома Балаховічы гаварылі па–беларуску. Станіслаў ведаў таксама расейскую, польскую (даволі дрэнна) і літоўскую мовы. Знаёмы быў з польскай і беларускай літаратурай, але ягоным улюбёным героем быў гогалеўскі Тарас Бульба. Адбілася гэта прыкметна і на пазьнейшай "балахоўшчыне".

Станіслаў Булак–Балаховіч быў непрымірымым ворагам самадзяржаўя. Непасрэднай прычынай гэтага была сямейная трагедыя. Падчас рэвалюцыі 1905 г. ягоныя дваюрадныя браты, Ян і Павал Балаховічы, былі прысуджаныя на сьмяротнае пакараньне за рэвалюцыйную дзейнасьць, у сувязі з чым памёр ад хваляваньня іхны бацька Людвік. Пасьля гэтага прысуд быў заменены катаргай. Станіслаў стаў чальцом партыі сацыялістаў–рэвалюцыянэраў. Кіраўніком эсэраўскай ячэйкі ў Дзісенскім павеце, да якой ён належаў, быў Павал Аляксюк (у 1920 г. самы блізкі палітычны супрацоўнік Булак–Балаховіча). Падчас рэвалюцыйных хваляваньняў у 1905 г. Станіслаў умела лагодзіў спрэчкі паміж сялянамі і памешчыкамі ў Дзісенскім павеце. Ужо тады Булак–Балаховіч атрымаў ад сялянаў мянушку "Бацька", якая засталася за ім на ўсё жыцьцё.

## Літаратура:

1. Сьведчаньне генэрала Булак–Балаховіча ад 7 сьнежня 1929 г. "Mój życiorys i moja działalność do czasu I wojny światowej, podczas wojny światowej i w czasie pokoju", Centralne Archiwum Wojskowe. Wojskowe Biuro Historyczne. 1400.2134.

2. Bułak-Bałachowicz S. Precz z Hitlerem!, czy Niech żyje Hitler! Warszawa, 1933.

3. List otwarty gen. Bułak–Bałachowicza do Sejmu Ustawodawczego Rzeczypospolitej Polskiej. Warszawa, 7.IV.1922 r.

4. На чужыне (Рыга). 1920. № 1.

5. Інфармацыя Мацея Булак–Балаховіча, унука Станіслава.

*Друкуецца паводле публікацыі ў:* Браслаўскія чытанні. Матэрыялы III–й навукова–краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 200 угодкам паўстання 1794 года. 21—22 красавіка 1994 г. Браслаў, 1994. С. 68—69.